ПАСТАНОВА
Савета аддзела ідэалагічнай работы,
культуры і па справах моладзі
Пінскага райвыканкама
ад «25» ___04___2019г. №_8_
г. Пінск

Аб правядзенні сярод бібліятэк
дзяржаўнай установы культуры
«Пінская раённая цэнтралізаваная
бібліятэчная сістэма» раённага
агляда-конкурсу на лепшую тэатралізаваную
імпрэзу «Ішоў наш край дарогамі вайны»

У азнаменаванні 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, з мэтай захавання памяці аб героях-земляках Вялікай Айчыннай вайны, патрыятычнага выхавання моладзі і падрастаючага пакалення, Савет аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Пінскага райвыканкама
ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Раённы агляд-конкурс на лепшую тэатралізаваную імпрэзу «Ішоў наш край дарогамі вайны» правесці з 20 па 27 мая 2019 года.
2. Зацвердзіць палажэнне аб раённым аглядзе-конкурсе, склад журы (Дадатак 1,2).
3. Аддзелу бібліятэчнага маркетынгу ЦРБ імя Яўгеніі Янішчыц забяспечыць удзел усіх бібліятэк у раённым аглядзе-конкурсе на лепшую тэатралізаваную імпрэзу «Ішоў наш край дарогамі вайны».
4. Кантроль за правядзеннем раённага агляду-конкурсу ўскласці на дырэктара дзяржаўнай установы культуры «Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» А.І.Анташук.

Старшыня Савета,
начальнік аддзела
ідэалагічнай работы,
культуры і па справах моладзі
Пінскага райвыканкама Л.В.Галавач

ДАДАТАК № 1

да Пастановы
Савета аддзела ідэалагічнай работы,
культуры і па справах моладзі
Пінскага райвыканкама
ад «25» 04 2019г. № 8

ПАЛАЖЭННЕ

аб правядзенні сярод бібліятэк дзяржаўнай установы культуры «Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» раённага агляда-конкурса на лепшую тэатралізаваную імпрэзу «Ішоў наш край дарогамі вайны»

## I. Асноўныя мэты і задачы агляда-конкурсу

- актывізацыя інфармацыйнай работы бібліятэк у рамках 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў;

- абагульненне і распаўсюджванне эфектыўных форм і метадаў работы па гісторыка-патрыятычнаму выханню;

- садзейничанне захаванню гісторыка-культурнай спадчыны.

## II. Парадак і ўмовы правядзення конкурса

1. У раённым аглядзе-конкурсе прымаюць удзел усе бібліятэкі дзяржаўнай установы культуры «Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма».
2. Конкурс будзе праходзіць па зонах:
   1-я зона: 20.05.2019г.
   Бібліятэкі Пінкавіцкага, Гарадзішчанскага, Сошненскага, Парахонскага, П.-Загародскага, Навадворскага сельвыканкамаў, Аснежыцкая СБ.
   2-я зона: 22.05.2019г.
   ЦРБ імя Я.Янішчыц
   3-я зона: 23.05.2019г.
   Бібліятэкі Бабрыкоўскага, Лышчанскага, Лагішынскага, Валішчанскага сельвыканкамаў, Аснежыцкая СБ.
   4-я зона: 24.05.2019г.
   Бібліятэкі Ласіцкага, Лапацінскага, Калавуравіцкага, Плешчыцкага, Хойнаўскага, Дубайскага сельвыканкамаў.
   5-я зона: 27.05.2019г.
   Бібліятэкі Ставоцкага, Мерчыцкага Парэцкага, Ахоўскага, Бярозавіцкага, Малоткавіцкага сельвыканкамаў.
3. Сцэнарый мерапрыемства прадастаўляецца журы.
4. Працягласць мерапрыемства не больш за 20 хвілін.

## III. Крытэрыі адзнакі:

1. Інфармацыйная насычанасць, патрыятычная накіраванасць.
2. Уключэнне ў сцэнарны матэрыял краязнаўчага аспекту (выкарыстанне краязнаўчага матэрыялу, запрашэнне ветэранаў, дзяцей вайны, былых вязняў фашысцкіх канцлагераў).
3. Творчы падыход да тэатралізацыі.
4. Граматнасць і прафесійны ўзровень бібліятэкараў у прадстаўленні мерапрыемства.
5. Музычнае і нагляднае афармленне.

## IV. Падвядзенне вынікаў і ўзнагароджванне пераможцаў.

1. Падвядзенне вынікаў адбудзецца на выніковай нарадзе бібліятэкараў за 1 паўгоддзе 1019 года.
2. Пераможцы (1, 2, 3 месца) у раённым аглядзе-конкурсе узнагароджваюцца ганаровымі граматамі і грашовымі прэміямі.
3. Лепшыя матэрыялы будуць апублікаваны ў інфармацыйна-рэкламным бюллетэне «Кругозор», на сайце цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Я.Янішчыц http://crbpinsk.brest.by і ў СМІ.

ДАДАТАК № 2

да Пастановы
Савета аддзела ідэалагічнай работы,
культуры і па справах моладзі
Пінскага райвыканкама
ад «25» 04 2019г. № 8

## СКЛАД ЖУРЫ

па правядзенню сярод бібліятэк дзяржаўнай установы культуры «Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» раённага агляда-конкурса на лепшую тэатралізаваную імпрэзу «Ішоў наш край дарогамі вайны»

1. Галавач Л.В. – начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Пінскага райвыканкама.
2. Знавец Н.В. – дырэктар дзяржаўнай установы культуры “Пінская раённая цэнтралізаваная клубная система”.
3. Анташук А.І. – дырэктар дзяржаўнай установы культуры «Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»
4. Антанчук В.М. – намеснік дырэктара дзяржаўнай установы культуры «Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»
5. Міхалевіч К.Л. – загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу ЦРБ імя Яўгеніі Янішчыц.
6. Папіціч Л.І. – галоўны бібліятэкар аддзела бібліятэчнага маркетынгу ЦРБ імя Яўгеніі Янішчыц.
7. Жылевіч В.І. – метадыст аддзела бібліятэчнага маркетынгу ЦРБ імя Яўгеніі Янішчыц.